# Пра кніжку аб эміграцыі

Пра кніжку Барыса Сачанкі “Беларуская эміграцыя”[1] пішу толькі з пачуцьця грамадзкага абавязку, бо ніякая сур’ёзная рэцэнзія не атрымліваецца. Недарэчнасьць пачынаецца ўжо з самога загалоўка. Пра эміграцыю ў кніжцы ўсяго некалькі старонак, астатняе — пра беларускую культуру, а дакладней — пра беларускую літаратуру на эміграцыі. Усё гэта аздоблена паклёпамі на “фашысцкіх наймітаў”, якія без дазволу бацькі Сталіна “надта ж хутка” стварылі беларускія арганізацыі, школы, часопісы і тэатар. Тлумачыць Сачанкавы ўяўленьні пра акупацыю і вайну няма сэнсу. Хто дасюль не зразумеў, што Сталін быў злыднем зусім ня лепшым за Гітлера, той гэты час не зразумее ніколі.

Сапраўднай літаратурнай крытыкі таксама ў кніжцы няма, а ўсю творчасьць аўтар зводзіць да тугі няшчасных эмігрантаў па бацькаўшчыне (і добра ім так!). Беларускай мовай для Б. Сачанкі зьяўляецца толькі мова пасьля сталінскай рэформы і таму ня дзіва, што паводле яго Янка Станкевіч “асабліва не вылучаўся добрым густам і ведамі беларускай літаратурнай мовы”.

У кніжцы два заканчэньні. Адно — “У працяг размовы”, напісанае ў 1989 годзе, у якім аўтар у адказ на водгук Янкі Запрудніка на сваю пісаніну пытаецца: “Няўжо і сёньня яшчэ ёсьць прастакі, хто верыць такім, клюе на іхную прыманку?..” У другім заканчэньні, “Пасьляслоўі” з 1991 году, чытаем, што ўва Ўсясьветным кангрэсе беларусістаў браў удзел Янка Запруднік. І я там быў і бачыў, зь якім энтузіязмам на кангрэсе ў Менску віталі таго ж Запрудніка, хаця ён сваіх поглядаў не зьмяніў.

Як заўважыў раней аўтар: “Увесь час беларускія эміgranцкія выданьні імкнуліся падтрымліваць новыя рухі, моладзь. Асабліва тыя, што ў Савецкай Беларусі. Рабілася ды і робіцца пэўная стаўка — маўляў, усё ранейшае, старэйшае “абальшавічана”, а вось новае, маладое вабіць “вольны сьвет”, разумее ўсіх, хто там”. Сёньня відаць ужо ясна, што гэтая стаўка апраўдалася.

*Друкуецца паводле:*
Ніва. 1991. 1 сьнежня. № 48. С. 4.

[1] Сачанка Б. Беларуская эміграцыя: Выданне другое, дапоўненае і папраўленае. Мінск, 1991.